№ 07 (456)
Люты 2013 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ Традыцыі: *каласы на покуці, радавая свечка –* стар. 4

☞ Даследаванне: *іранізмы Максіма Гарэцкага –* стар. 5

☞ Рэха падзеі: *пасля кніжнага кірмашу –* стар. 6

Жыве вёсачка Люсіна

Ужо болей дзесяцігоддзя бібліятэкі Ганцавіцкай РЦБС плённа працуюць у рамках адраснай праграмы «Памяць Ганцаўшчыны», распрацаванай аддзелам бібліятэчнага маркетынгу для мэтанакіраванай краязнаўчай дзейнасці. Як вынік – адкрыццё гісторыка-краязнаўчых цэнтраў у бібліятэцы аграгарадка Агарэвічы пад назвай «Буслiны край, мой вырай і прыстанак» і ў Нацкай сельскай бібліятэцы – «Калі малая ёсць Радзіма, ёсць і вялікая ў цябе», галерэі знакамітых людзей у Дзяніскавіцкай сельскай бібліятэцы, духоўна-асветніцкага цэнтра «Існасць» у сельскай бібліятэцы Вялікіх Круговічаў і інш.

Ёлета спаўняецца 22 гады, як пры бібліятэцы аграгарадка Люсіна было арганізаванае аматарскае таварыства «Юны краязнаўца». Стварэнне клуба менавіта з такою назвай было неабходнасцю, бо Люсіна – адна з вёсак Ганцаўшчыны, дзе захоўваюць абрады і звычаі сваіх продкаў, з павагай ставяцца да культурнай спадчыны і гісторыі краю, шануюць матчыну мову. І сёння ў вясковых хатах можна пабачыць ткацкі станок альбо колаварот, некаторыя прадметы даўніны. Трэба адзначыць, што люсінскія жанчыны вельмі працавітыя, а ў доўгія зімовыя вечары яны заўсёды знаходзяць сабе занятак: прадуць, ткуць, вяжуць, вышываюць. Тут што ні хата, то – майстрыха. «Юныя краязнаўцы» часта арганізоўваюць сустрэчы і майстар-класы. Майстрыха па ткацтве Соф'я Сямёнаўна Сенюковіч з хваляваннем гаворыць: «Для мяне вельмі важныя такія сустрэчы з моладдзю. Калісьці маёй матулі майстэрства ткацтва перадала мая бабуля, а ёй – яе матуля. І так – з пакалення ў пакаленне. Хацелася, каб на мне гэтая справа не спынілася. Пры сустрэчы з моладдзю заўважаю, як свецяцца іх вочы, як цікава ім спазнаваць усе тонкасці ткацтва. Лічу, такія майстар-класы вельмі карыснымі для іх і веру, што справа майго жыцця прадоўжыцца».

(Заканчэнне на стар. 3)

Хачу спяваць табе, зямля

Добры дзень, шаноўныя супрацоўнікі «Краязнаўчай газеты»! Нам вельмі прыемна знаёміцца з новымі імёнамі на старонках вашага выдання. Мы ўдзячныя, што вы заўсёды друкуеце нашыя артыкулы пра бібліятэкі Жлобіншчыны. Сёння ж хочацца распавесці пра Марыю Смірнову, імя якой добра вядомае ў раёне.

Нядаўна ў Жлобінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся вечар-сустрэча «Хачу спяваць табе, зямля», прысвечаны 50-годдзю творчай дзейнасці М. Смірновай, былой настаўніцы рускай мовы і літаратуры (працавала ў адукацыі 38 гадоў). Яе вершы часта друкуюцца на старонках нашай раённай газеты «Новы дзень» (дарэчы, газета стала называцца так з прапановы М. Смірновай, раней называлася «Камуніст»). Яе вершы друкаваліся ў часопісе «Голман», у кнізе «Вуліца настаўніцкая» і іншых выданнях, а ў жлобінскай друкарні пабачылі свет два зборнікі вершаў: «След на земле» (1993) і «Хачу спяваць табе, зямля» (2012). Песня пра Жлобін «На Дняпры ён нарадзіўся» на словы М. Смірновай стала гімнам горада (перамагла ў конкурсе), а музыку напісала настаўніца Таццяна Дакутоўская (абедзве працавалі ў СШ № 10). Паэтка піша вершы на беларускай і

рускай мовах, тэмы іх самыя разнастайныя: пра Беларусь, прыроду, чалавечыя пачуцці, прысвечаныя паэтам усіх часоў, гумарыстычныя, сатырычныя. Вось некаторыя ўрыўкі.

Мая зямля, мая Айчына,
Табой з дзяцінства ганарусь:
Мяне, як маці песціць сына,
Мая Радзіма Беларусь.

***

Зямля маіх бацькоў,
За ўсё табе паклон:
За тое, што ізноў
Птушыны чую звон,
За сонца, што вясной
Мне прывітанне шле,
За лёс шчаслівы мой,
За вершы на стале.

***

О книга! –
Верный друг
И спутник мой,
Я счастлива
Наедине с тобой.
Ты для меня
Открыла бездну
Мирозданья:
Ты кладезь мудрости
И вечного познанья.

На імпрэзу ў бібліятэку завіталі мясцовыя паэты Павел Луд, Іосіф Рынейскі, Таццяна Нікалаенка, а таксама Мікалай Шуканаў, карэспандэнт раённай газеты «Новы дзень», навучэнцы аграрна-тэхнічнага каледжа, аднакласнікі паэткі, чытачы бібліятэкі, прыхільнікі яе творчасці. Вершы М. Смірновай прагучалі ў выкананні аўтара, бібліятэкараў Святланы Кудравец, Алы Якуш, Тамары Ткачовай і інш. Песні на яе словы праспяваў дзіцячы ансамбль «Ліра» школы мастацтваў № 1 пад кіраўніцтвам Алены Марозавай. Вядучымі вечарыны былі Алена Федарэнка і Святлана Кудравец. У адрас паэткі прагучала шмат цёплых пажаданняў і вечарына атрымалася сардэчнай, душэўнай.

Ніна КАРПАВА,
галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Жлобінскай ЦРБ

Недарэчная памылка

Ёсць цікавая старая паштоўка, якая ўвайшла ў якасці ілюстрацыі ў шматлікія выданні – папулярныя, навуковыя, альбомныя і г.д. Паштоўка, на якой стаіць арыгінальны друкарскі надпіс, зроблены яшчэ да Першай сусветнай вайны. І гэты аўтэнтычны надпіс гаворыць: «Лунно, Грод. губ. Старинная еврейская синагога».

Вось тыповы прыклад таго, што да крыніцаў трэба ставіцца крытычна, нават да дакументальных. Бо памылка потым уваходзіць як неаспрэчная ісціна спачатку ў навуковыя працы, а затым праз папулярызацыйную працу замацоўваецца ў масавай свядомасці і становіцца чарговым устойлівым міфам, які нічога не мае агульнага з рэчаіснасцю.

Як і з лунненскай сінагогай. Лунна – цяпер асобны населены пункт, вёска, цэнтр сельскага Савета ў Мастоўскім раёне. Раней жа Лунна – гэта мястэчка з гандлёвым пляцам і забудовай вакол яго, а з усходу прымыкала да мястэчка аднавулічнае прадмесце пад назвай Воля. Дарэчы, вельмі часта раней паселішча, мястэчка і прадмесце, так і звалі – Лунна-Воля.

Драўляная сінагога ў Лунне на прадмесці Воля ў 30-я гг. XX ст.

Непасрэдна ў мястэчку побач з вялікай гандлёвай плошчаю стаяла мураваная сінагога. Яна не захавалася. На яе месцы цяпер дом культуры. Была і драўляная. Знаходзілася яна менавіта ў Волі. Зямельны пляц, на якім стаяла сінагога, выяўлены, даследаваны, зробленыя фіксацыйныя абмеры і фотафіксацыя рэштак падмуркаў сінагогі. Вядомыя фотаздымкі 1930-х гг., на якіх драўляная сінагога выяўленая. Папярэдні аналіз фотаздымкаў і ацалелых фрагментаў падмуркаў дазваляе зрабіць выснову, што аб'ект на фотаздымку знаходзіўся менавіта на даследаваным зямельным пляцы.

Так што сінагога на паштоўцы – не з гэтага мястэчка. А з якога тады? Тут усё вельмі проста. На ўсход ад Лунны, на паўдарозе да Ваўкавыска, знаходзіцца Воўпа – сярэднявечны горад з магдэбургскім правам, за Расійскай імперыяй і Польшчай – мястэчка, а цяпер звычайная вёска, цэнтр сельскага Савета ў Ваўкавыскім раёне. Нават пасля Другой сусветнай вайны захоўваўся ў мястэчку велічэзны аб'ём драўлянай сінагогі XVIII ст., у якім спалучаліся традыцыйныя прыёмы яўрэйскага культавага будаўніцтва і рысы барока.

Іканаграфія сінагогі вядомая. Гэта выявы 1920–1930-х гг., нават ёсць здымак, зроблены вядомым беларускім мастацтвазнаўцам Міхаілам Кацарам у 1947 г. Менавіта гэтыя выявы і даюць разгадку. Пад надпісам «Лунно, Грод. губ. Старинная еврейская синагога» на паштоўцы выяўленая сінагога ваўпянская. Як такая памылка здарылася, трэба яшчэ разгадаць. Але не трэба адкідваць думку, што непасрэдная блізкасць Лунны і Воўпы сталася адной з прычынаў гэтай недарэчнасці.

Лунно, Грод. губ. Старинная еврейская синагога



Сінагога ў Воўпе на малюнку Вітальда Карпызы, 30-я гг. XX ст.

Антон АСТАПОВІЧ

Індывідуальная падпіска — **Індэкс 63320**

1 месяц	15 850 руб.
3 месяцы	47 550 руб.
6 месяцаў	95 100 руб.

Ведамасная падпіска — **Індэкс 633202**

1 месяц	16 196 руб.
3 месяцы	48 588 руб.
6 месяцаў	97 176 руб.

Падпісацца на нашую газету можна ў любым месяцы. Будзьма разам, сябры!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ *на газету* 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Колькасць камплектаў

на 20__ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Кошт: падпіскі _____руб. / пераадрасоўкі _____руб. — Колькасць камплектаў

на 20__ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

На тым тыдні...

✓**6 лютага** дыплом 2-й ступені Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі-2013» атрымала выдавецтва «Тэхналогія» **за кнігу Юрыя Лаўрыка «Кнігі і кнігазборы куцеінскага Богаяўленскага манастыра ў сярэдзіне XVII ст.»**.

Манаграфія распавядае аб выдавецкай і кнігазбіральніцкай дзейнасці брацыі праваслаўнага манастыра ў Куцейні ў найбольш яскравы перыяд яго гісторыі. Выданне здзейсненае дзякуючы фінансавай падтрымцы генеральнага партнёра Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь – кампаніі ЈТІ.

✓**12 лютага** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася **музычна-забаўляльная імпрэза «Вечарына Валянціна»**, прымеркаваная да дня закаханых. Удзельнікам было прапанаванае іранічна-рамантычнае «валянцінаўскае» выступленне студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з культурнай праграмай «Зорка кахання», выступ фолк-рок гурта «Alta mente» і Кацярыны Ваданосавай, а таксама варажба на лёс і каханне і інш.

✓**14 лютага** ў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры правялі **літаратурна-музычную вечарыну «Сустрэў я Вас...»**, дзе госці сустрэліся з вядомым бардам, паэтам, перакладчыкам Алесем Камоцкім, паэткай, лаўрэатам шматлікіх літаратурных конкурсаў і прэмій Людмілай Паўлікавай-Хейдаравай, бардам, мастацкім кіраўніком студэнцкага тэатра «Жывое слова» Алесяй Сівохінай.

✓**З 14 па 16 лютага** ў Інстытуце імя Гётэ адбыўся **Другі міжнародны паэтычны фестываль «Вершы на асфальце»**, прысвечаны памяці Міхася Стральцова. Арганізатарамі выступілі Саюз беларускіх пісьменнікаў, Беларускі ПЭН-цэнтр, Інстытут імя Гётэ ў Мінску, а таксама Шведскі саюз пісьменнікаў. Сярод замежных удзельнікаў былі паэты з Германіі, Літвы, Расіі, Украіны, Швецыі, Эстоніі. Праграму фестывалю склалі міжнародны паэтычны слэм, традыцыйныя паэтычныя чытанні, а таксама некалькі прэзентацыяў, у тым ліку кніжных серый «Кнігарня пісьменніка» і «Пункт адліку», узнагароджанне пераможцаў конкурсу імя Максіма Танка.

✓**15 лютага** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў рамках святкавання 20-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносінаў паміж Рэспублікай Беларусь і Азербайджанскай Рэспублікай адбылася **прэзентацыя мініяцюрнага выдання Янкі Купалы «Жалейка»** і перадача яго ў дар НББ.

Двухтомнік пабачыў свет у выдавецтве «Indigo» (г. Баку). Стваральнікам беларускамоўнага выдання з'яўляецца старшыня Азербайджанскага таварыства «Кніга», дырэктар бакінскага Музея мініяцюрных кніг Зарыфа Салахава.

✓**18 лютага** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прэзентавалі выстаўку **«Браму скарбаў сваіх адчыняю ...»**, прысвечаную 120-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка, публіцыста, вучонага, педагога Максіма Гарэцкага. Юбілейная экспазіцыя, падрыхтаваная на аснове шматлікіх архіўных матэрыялаў і друкаваных дакументаў з фонду аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў, распавядае пра жыццёвы і творчы шлях выдатнага творцы. Сярод экспанатаў – арыгіналы рукапісаў пісьменніка, у тым ліку першыя спробы пяра, датаваныя 1912 г., рукапіс «Камароўскай хронікі», пераклад на рускую мову «Віленскіх камунараў», шматлікія занатоўкі, накіды, незавершаныя творы, іншыя творчыя матэрыялы, а таксама фальклорныя запісы. Экспазіцыя ўключае дакументы да біяграфіі пісьменніка, цікавыя фатаграфіі як самога М. Гарэцкага, так і яго бацькоў, здымкі з братамі Іванам і Гаўрылам, з жонкай Л. Чарняўскай-Гарэцкай, дзецьмі і інш.

Школьнае краязнаўства

Паданні пра каханне

Васілёва

У адной вёсцы жылі дзве сям'і, якія вельмі сябравалі паміж сабой. Праз некаторы час у адной з іх нарадзілася дзяўчынка Алена, а ў другой – хлопец Васіль. З самага дзяцінства Алена з Васілём ніколі не расставаліся, заўсёды былі разам. Людзі ажно дзівіліся з іх моцнага сяброўства.

Прайшлі гады. Васіль закахаўся ў Алену. Яна таксама адказвала яму ўзаемнасцю. Бацькі былі вельмі радыя, што іх дзеці кахаюць адно аднаго. Усе пачалі ўжо рыхтавацца да вяселля. Але аднойчы ў вёску прыехаў пан, і яму вельмі спадабалася Алена. Супраць яе волі павёз пан дзяўчыну ў свой палац. Але Васіль не жадаў аддаваць сваю нявесту ніякаму пану і паехаў за імі. Калі яны сустрэліся, Васіль пачаў гаварыць пану, што ён кахае Алену, а яна – Васіля. Калі пан паглядзеў ім у вочы, то яму стала шкада маладых. Тады і сказаў:

– Забірай сваю нявесту, але калі ты будзеш яе зневажаць, то я такім добрым не буду.

Васіль і Алена справілі вяселле і жылі доўга і шчасліва. Было ў іх шмат дзяцей і ўнукаў. Вёску, дзе жылі Васіль і Алена, сталі называць Васілёва вёска, як памяць аб моцным каханні.

(Запісана ад Анастасіі Архіпаўны Садкоўскай, 1923 г.нар., в. Палата.)

Казімірова

З дарогі відаць возера. Яно вялікае і маляўнічае. Берагі яго нізкія, парослыя з аднаго боку лазняком, з другога відаць вялікія дрэвы. На возеры ўлетку растуць гарлачыкі, плаваюць дзікія качкі.

На беразе возера стаяла невялічкая вёсачка, у якой жылі добрыя і працавітыя людзі. Гэтая вёска і зямля належалі вяльможнаму пану. Жыў ён недзе далёка, а наведваўся сюды толькі ўлетку.

Аднойчы з бацькам прыехаў сын Казімір, які вельмі любіў хадзіць на паляванне. У час аднаго з паляванняў і вырашыўся лёс маладога паніча. На ўзгорачку каля возера ён сустрэў прыгажуню Натальку. Яны спадабаліся адно аднаму і закахаліся. Кожны раз сустракаліся на беразе возера, якое слухала іх размовы і радавалася іх каханню.

Паніч не захацеў ехаць з бацькам у горад, бо не жадаў развітвацца з дзяўчынай. На месцы сустрэчы са сваёй каханай ён вырашыў пабудаваць маёнтак. Хутка дом быў пабудаваны, і маладыя справілі вяселле.

З гэтай пары паніча ўжо не вабіла паляванне. Ён не жадаў пакідаць у адзіноце сваю прыгажуню, таму і стаў займацца земляробствам.

Вакол маёнтка пасадзілі ліпы, частка якіх яшчэ і сёння радуе людзей сваёй прыгажосцю. Улетку водар разносіцца па наваколлі. Далёка чуецца пчаліны гул.

Пражылі Казімір і Наталька доўга і шчасліва. Пан Казімір добра ставіўся да сваіх сялянаў. Так і жыла вёска з года ў год. Удзячны люд за дабрыню пана Казіміра назваў вёску Казімірова.

І сёння старыя ліпы каля возера нагадваюць вяскоўцам пра добрага пана.

(Запісана ад Зінаіды Бычковай, 1923 г.нар., в. Казімірова.)

Святлана САЛЬНІКАВА,
вучаніца 11 класа
Дзяржаўнай установы адукацыі
«Палатоўская дзіцячы сад-сярэдняя школа Полацкага раёна»

Жыве вёсачка Люсіна

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Ў бібліятэцы дэманструюцца цудоўныя вырабы рукадзельніцаў: сурвэткі і ручнікі, абрусы і посцілкі. Вырабы мясцовых майстрых вызначаюцца яркім каларытам. Дзякуючы намаганням сяброў клуба створанае змястоўнае дасье «Узор душы і рук набытак», дзе сабраны матэрыял пра кожную майстрыху вёскі. Чытачы з цікавасцю праглядаюць дасье, дзе занатаваныя не толькі аповеды пра жанчынаў, але і фота іх твораў. Моладзі цікава спазнаваць усё тое, што нябачнаю ніткай звязвае іх з мінулым. Таму ў «Майстар-класе ад бабулі Зосі» яны ўдзельнічалі з вялікім задавальненнем. Сустрэча адбылася дома ў Соф'і Аляксандраўны Цялушка. Жанчына ўспамінала таксама, як ёй даваліся першыя крыжыкі і шыўкі, як занятак вышыўкай дапамагаў у розных жыццёвых абставінах.

Не так даўно ў рамках пасяджэння клуба «Юны краязнаўца» адбылася вечарына з удзелам фальклорнага гурта «Дубравушка», створаным пры мясцовым доме культуры. Яго ўдзельніцы жанчыны паважанага ўзросту, у мінулым розныя па прафесіях людзі, якіх аб'ядноўвае адзінае – захапленне і любоў да роднага слова, да беларускай народнай песні. Жанчыны дзяліліся ўспамінамі аб тым, як у іх жыццё ўвайшла народная песня, узгадвалі гады маладосці. У гэты дзень срэбнасветлым ручаём лілася ў бібліятэцы матуліна песня, такая далёкая і блізкая для юных чытачоў.

Люсінскі край адметны яшчэ і тым, што тут на пачатку мінулага стагоддзя пачынаў сваю працоўную дзейнасць Якуб Колас. Гэты перыяд свайго жыцця пісьменнік апісаў у першай частцы трылогіі «На ростанях» – «У палескай глушы». На працягу многіх гадоў бібліятэчнымі краязнаўцамі па крупінках быў сабраны матэрыял пра коласаўскія пуцявіны на люсінскай зямлі, звесткі пра людзей, якім пашчасціла сустрэцца з пісьменнікам, пра яго вучняў. Даследчыя матэрыялы былі аформленыя ў тэматычныя папкі. Летась да 130-годдзя з дня нараджэння пісьменніка бібліятэка выдала два гісторыка-дакументальныя зборнікі ў серыі «Якуб Колас і Люсіна»: «Коласаўскія парасткі», «Сцяжынкамі Коласа – у памяць светлую».

Асаблівай папулярнасцю ў чытачоў карыстаецца каляндар, выдадзены бібліятэкай да юбілею песняра «Якуб Колас: сцяжынкамі памяці», дзе кожная старонка – невялікае падарожжа па коласаўскіх мясцінах.

«Юныя краязнаўцы» часта з'яўляюцца ініцыятарамі і ўдзельнікамі розных конкурсаў і акцый. Так яны не толькі ўдзельнічалі ў конкурсе «Ад вёскі мой пачатак» да юбілею Якуба Коласа, але некаторыя сталі яго пераможцамі. Адна з іх –паэтычная зорачка Насця Амельяновіч. Чытаеш верш дзяўчынкі і разумееш, што на люсінскай зямлі памятаюць вялікага пісьменніка.

Сустрэча ў бібліятэцы з фальклорным гуртом «Дубравушка»

Вясковай вуліцай прайдуся,
Якой хадзіў з Ядвісяй Колас.
І крыху з сумам усміхнуся –
З мінулага аклікне голас:
«Назад не прыйдзе хваля тая,
Што з быстрай рэчкай уплывае...».
Ахіне сэрца раптам смутак –
Тут ўсё ў мінулым застанецца:
Каханне іх, і дуб-крапак,
І толькі рэха адгукнецца:
«Назад не прыйдзе хваля тая,
Што з быстрай рэчкай уплывае...».

Тамсама ў клубе адбылася вечарына «Вершы пішуцца ад рукі...» з мясцовай паэткай, сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі, Святланай Локтыш, якая да таго ж яшчэ таленавітая спявачка і рукадзельніца.

У народзе кажуць: «Не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек – месца». Так можна сказаць пра бібліятэкара Люсінскай бібліятэкі Алену Сяргейчык. Жанчына не так даўно працуе тут, але змагла згуртаваць вакол сябе дзяцей розных узростаў, якія з вялікім жаданнем наведваюць бібліятэку. Яны ведаюць, што іх тут чакаюць цікавыя сустрэчы і новыя справы. Пасяджэнні клуба «Юны краязнаўца» выходзяць за сцены бібліятэкі: гучныя чытанні аповесці Якуба Коласа «У палескай глушы» праходзілі каля векавога дуба – сведкі сустрэчаў Лабановіча і Ядвісі, бралі майстар-класы па ткацтве і вышыўцы, завітаўшы дамоў да майстрых, сустракаліся на свяце «Пясняр зямлі беларускай» з сынам, унукам і праўнучкай класіка.

А яшчэ Алена Уладзіміраўна добры краязнаўца. Яе цікавіць усё, што датычыцца мінулага роднай вёскі Люсіна. Яна зберагае сямейныя рэліквіі і ахвотна паказвае іх дзецям. Тут і дзядулевы ўзнагароды «За взятие Берлина», юбілейныя медалі і бабуліны ткаными ручнікі, сурвэткі. Разам з сябрамі клуба яна гутарыць з людзьмі старэйшага пакалення пра мінулае вёскі і ўсё занатоўвае, каб потым у бібліятэцы з'явіліся новыя папкі. Для яе вельмі важна, каб імёны яе землякоў, тых, хто ствараў гісторыю роднай вёскі, не сышлі ў нябыт.

Для мэтанакіраванай працы бібліятэкары стварылі памяткі «Юнаму краязнаўцу». Невялікія выданні вучаць маладых даследчыкаў асновам краязнаўства: спазнаваць, што такое народ, у чым праяўляецца патрыятызм, як з гонарам праз жыццё пранесці сваё імя і г.д.

Бібліятэкары З. Літвіновіч і А. Сяргейчык штодзённа даносяць да чытачоў простую ісціну – любоў да мовы, Бацькаўшчыны прыходзіць праз веданне літаратуры, гісторыі, культуры, побыту мясцовасці. Яны імкнуцца захаваць і памнажаць здабыткі, развіваць цікавасць да чытання лепшых твораў беларускіх пісьменнікаў. А цікавасць чытачоў да сваіх каранёў, да сваёй спадчыны выклікае неабходнасць як мага больш назапасіць інфармацыі па краязнаўстве.

З дня ў дзень пад дахам невялічкага кніжнага храма, аграгарадка, адраджаюцца гістарычная памяць і культурная спадчына палескай вёсачкі Люсіна. Справа добрая і патрэбная для нашчадкаў.

С. Цялушка дзеліцца сакрэтамі вышыўкі

Таццяна МАЛЯЎКА,
метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ганцавіцкай РЦБС

Каласы пад сярпом тваім

Без хлеба куса няма жыцця ў беларуса
Прыказка

Не адзін дзень наведнікаў філіяла Веткаўскага музея народнай культуры радуе выстаўка «Ад поля да покуці». Здаецца, пры чым жніво і жыта да зімы? Няўжо спазніліся з выстаўкай? *«Ды не,* – тлумачыць загадчык філіяла Веткаўскага музея Пятро Цалка, – *самым непасрэдным чынам абрад жніва звязаны з простым прадметам, які мы бачым кожны дзень, ужываем у ежу, – з хлебам, што трапляе з цягам часу ад поля на стол, на покуць – самае галоўнае месца ў хаце*».

Першы этап жніва – зажын. Апякункай зажыну выступае Божая Маці Траяручыца, чыя ікона прадстаўленая на выстаўцы. Ёсць шмат легендаў пра тое, чаму ў Божай Маці з'яўляецца трэцяя рука. Галоўным ёсць вера кожнай жанчыны ў тое, што трэцяй рукой Божая Маці дапамагае, паколькі неймаверную колькасць працы робіць жанчына за ўсё жыццё. Як было запісана пад час экспедыцыі ў в. Стаўбун, жанчыны пачыналі зажынаць жыта, калі ужо была зажатая на полі. Пасля і самі жнеі пачыналі працу.

Адна з кропак жніва – гэта першы зажын, які клаўся крыжам і такім чынам асвячаў усё поле і з хрысціянскага гледзішча (крыж Гасподні), і з язычніцкага (крыж як сімвал сонца). Таму ў жніўных песнях жанчыны звяртаюцца да неба, просяць: «падуй, ветрыку халодненькі», «перагані, Божа, хмарку». Акрамя таго, супрацоўнікамі Веткаўскага музея быў зафіксаваны вобраз калодзежа, які ставілі перад тым, як паставіць першую «бабку». Гэтыя снапы клалі па сонцы, пладавітасці. Так, першая ахвяра, праз якую ўлагоджвалі поле, – гэта каза. Вобраз казы задзейнічаны ў шматлікіх абрадах. Успомнім калядныя прыгаворкі, што суправаджаюць скокі казы: «Дзе каза рогам, там жыта стогам», «Дзе каза нагой, там жыта капой», «Дзе каза хвастом, там жыта кустом».

На выстаўцы можна ўбачыць два манекены ў выглядзе дзвюх прыгожа апранутых дзяўчынаў у мажных строях. У такіх строях жанчыны жыта не жалі, а прымалі ўдзел у абрадавых дзеяннях – зажыне і дажыне. Такім чынам жанчыны паказвалі, што робяць не простую справу, а звяртаюцца да Бога, да неба. Узоры неглюбскага строю, што прадстаўленыя на манекенах, вельмі сімвалічныя. Кожны арнамент (ці то на рукавах, ці то на падоле спадніцы, ці то на хусцінцы) за нешта адказвае. Таму жанчынаў можна параўнаць са жрыцамі, якія размалёўвалі сваё цела для выканання абраду. Жанчына пераапраналася ў такі строй не для эстэтызму, а дзеля наладжвання кантакту з небам.

Заканчваецца жніво дажынкамі. Цяпер мы прывыклі ўспрымаць дажынкі як маштабнае свята, калі ўсе гуляюць і весяляцца. А для селяніна, асабліва для сялянкі, гэта быў сакральны і вельмі інтымны рытуал. Жнеі збіраліся вузкім колам і апошнія каласкі жыта звязвалі пэўным чынам, робячы «бараду». «Барада» – гэта своеасаблівая ахвяра полю, ахвяра Богу. Увогуле, забаранялася пакідаць жыта на полі. Зробленыя запісы адзначаюць, што колькасць нязжатага калосся на полі, пакінутага

Сноп, в. Новыя Малынічы, Чачэрскі раён

Сакральнае месца – покуць

«Божая Маці зажне». Прычым, у вобразе Божай Маці не выступала рэальная жанчына, падобная да яе сваёй чысцінёй і цнатлівасцю. Як тлумачаць самі жанчыны, зразумець, калі Божая Маці зажынае, можна па палосцы, якая нейкім чынам выпісваючы тым самым сонечнае кола. Жнеі, з аднаго боку, прасілі сонечнага надвор'я, якое будзе садзейнічаць збору ўраджаю, з другога боку – каб яно моцна не пякло. Прадстаўленая на выстаўцы і саламяная каза (казёл) як сімвал жанчынай, у наступным годзе з поля знікне, пяройдзе на поле суседкі. Таму апошні лапік жыта не зжыналі, а рабілі з яго «бараду», якая ўяўлялася як нейкая істота: да яе звярталіся, ёй спявалі песні, ёй пакідалі ахвяру. Каля гэтага месца жнеі збіраліся абедаць, чым ставілі апошнюю тлустую кропку ў абрадзе жніва. Прычым, есці сядалі не абы-якія людзі – гультаі ці абібокі, а жанчыны, якія ўдзельнічалі ў працы пры зборы ўраджаю. «Бараду» пакідалі на полі, прыгаворваючы: «Вось табе, барада, хлеб-соль і вада». Шматлікі экспедыцыйны матэрыял, колькасць «бародаў», прадстаўленых на выстаўцы, сваёй веліччу і разнастайнасцю ўказваюць на важнасць гэтага моманту.

Далей рушым у тое сакральнага месца, куды трапляе хлеб праз пэўны час з поля, – на покуць. Чырвоны кут лічыўся самым важным месцам у хаце, таму яго адводзілі шаноўнаму госцю. Назва «чырвоны кут» тлумачыцца дваяка: па-першае, адлюстроўвае яго прыгажосць (чырвонае сонейка, красна дзевіца), па-другое, падкрэслівае значнасць гэтага месца ў жыцці чалавека – тут віселі іконы. Адведзенае месца іконам і на выстаўцы.

Важным на покуці з'яўляўся кожны прадмет: як толькі прадмет трапляў у чырвоны кут, то аўтаматычна рабіўся сакральным. Таму і абысціся ў гэтым месцы без жыта было немагчыма. Гэта і вобраз першага снапа, які жанчына, зажаўшы, прыносіла дахаты. Ён аберагаў хату, стымуляваў дастатак і стаяў да часу, калі яго абмалочвалі і пяклі першы хлеб з новага ўраджаю. Тут і калоссе з валошкамі, сімвалам працавітасці і прыгажосці, што прыносілі дзяўчаты з поля. На покуці знаходзіцца і куцця. Акрамя таго, адзін з атрыбутаў чырвонага кута – радавая свяча, якая ніколі не павінна згарэць: згарае свяча – згарае цэлы род. Гэтак род сачыў за сваім існаваннем.

Як бачым, чырвоны кут – гэта космас, своеасаблівы партал паміж зямлёй і небам. Стол – цэнтр яго, месца, з якога чалавек можа звяртацца да Бога. Набожнік з іконы над сталом абавязкова павінен кранацца стала, каб замкнуць кола звароту да Бога і атрымаць дапамогу ў выглядзе дастатку, што ўвасабляўся ў хлебе, кашы, якія стаялі на стале.

Так не хочацца пакідаць утульныя залы выстаўкі, прапахлыя хлебам, сонцам, летам. Тым не менш, заўсёды ёсць магчымасць патрапіць у атмасферу шчасця зноў і зноў. Гайда да золата жніва! Выстаўка працягнецца да канца сакавіка.

Марына ДАВІДЗЮК,
г. Гомель
Фота аўтара

Свята беларускага слова

Да сустрэчы з паэтам Міколам Лешчуном мы рыхтаваліся загадзя. Яна адбылася ў рамках свята Міжнароднага дня роднай мовы. У зале сабралася шмат людзей, сярод якіх былі вучні і настаўнікі. Напачатку вучні 9 «А» класа прачыталі вершы паэта. Затым слова трымаў сам М. Ляшчун. Нам цікава было дазнацца, што паэт нарадзіўся на Палессі ў в. Губарэвічы Хойніцкага раёна. Гэтая вёска – адна з тых, якія пацярпелі ад чарнобыльскай радыяцыі. Вельмі закрануў маю душу верш, у якім апяваецца загубленая вёска. Мікола Міхайлавіч кожны год прыязджае ў тыя мясціны і сумуе па роднай хаце, якой ужо няма.

Паэт працуе настаўнікам замежнай мовы ў Лагойску. У дзяцінстве ён не марыў быць настаўнікам, але не шкадуе аб выбары прафесіі, бо кажа: «Калі б не стаў настаўнікам, не стаў бы паэтам». Вось як ён піша аб гэтым:

Сярод паэтаў – я настаўнік,
Сярод настаўнікаў – паэт,
І незалежна ад абставін
Па-свойму ўспрымаю свет.

Вершы ён друкуе пад псеўданімам Мікола Згубарэвіч. Ён вельмі цікава расказваў нам гісторыі са свайго школьнага жыцця, узнёсла чытаў свае вершы.

М. Ляшчун вельмі любіць, калі яго вершы чытаюць вучні. Кажа: «Магу слязу пусціць». І далей жартуе: «Ранкам босымі нагамі хадзіце па расе і будзеце паэтамі».

Паэту вельмі падабаецца слова «заманіха». Ён у нас запытаў сэнс гэтага слова, але мы не здолелі адказаць. Паглядзелі ў слоўніку – гэта пастка. «Заманіха» – так хоча паэт назваць свой новы зборнік.

Сваю творчасць М. Ляшчун пачынаў з мастацкіх перакладаў з замежнай мовы, мае і некалькі ўласных вершаў на англійскай і нямецкай мовах. Вельмі любіць творчасць Пімена Панчанкі, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Сяргея Законнікава, Генадзя Бураўкіна. Паэт прызнаўся, што зайдросціць нашай школе, бо ў нас усе размаўляюць па-беларуску.

Самыя любімыя яго вершы пра маці. Таксама любіць чытаць вершы пра жонку і дачок. Некаторыя з яго твораў пакладзеныя на музыку.

Гэтая цёплая сустрэча была падобная на маленькае свята беларускага слова.

Валерыя ГІРО,
вучаніца Ільянскай СШ
імя А.А. Грымаця

Расстрэл з-за адсутнасці складу злачынства

Звыш 230-і чалавек згаданыя на старонках кнігі «Памяць» Жлобінскага раёна ў спісе ахвяраў масавых палітычных рэпрэсіяў у савецкі перыяд. Але гэта толькі невялічкая частка сапраўднай колькасці тых, хто быў бязвінна арыштаваны, а потым адпраўлены ў канцлагеры ці расстраляны. Таму сёння намаганнямі супрацоўнікаў Жлобінскага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея, мясцовай раённай газеты «Новы дзень» гэты спіс папаўняецца.

У ліку тых, хто трапіў пад кола сталінскай знішчальнай машыны, быў і жыхар Жлобіна, тэхнік лінейна-тэхнічнага вузла сувязі Іван Іванавіч Варановіч (1886–1938). Аб ім аўтару гэтых радкоў паведаміла яго стрыечная ўнучка, жыхарка Бабруйска Святлана Калюта.

І. Варановіч нарадзіўся 13 лістапада 1886 года ў сяле Жгунь Добрушскага раёна ў сям'і будучага праваслаўнага святара Іаана Міхайлавіча Варановіча, які з 1908 года і да самай сваёй гвалтоўнай смерці ў 1918-м (паводле іншых дадзеных, у 1919 ці 1920-м) ці то ад рук бальшавікоў, ці белапалякаў, ці немцаў служыў у сяле Лугавая Вірня цяперашняга Жлобінскага раёна. Як і бацька, І. Варановіч збіраўся прысвяціць жыццё служэнню Богу. Паступіў нават у Гомельскае духоўнае вучылішча, але з-за слабога здароўя не здолеў яго закончыць.

Да рэвалюцыі І. Варановіч таксама жыў і працаваў у Жлобіне. Служыў наглядчыкам у мясцовай паштова-тэлеграфнай канторы ў чыне губернскага сакратара, потым – кажэжскага. Даводзілася яму інспектаваць і школы. У 1913 годзе узяў шлюб з Лізаветай Карлаўнай Легздзін (1888–1983). Вянчаліся малады ў Лугавой Вірні. Жонка І. Варановіча паводле нацыянальнасці была латышкай. Пазней, пад час сталінскага гвалту ў 1930-я гады, гэта паслужыла падставай для яго абвінавачвання ў шпіянажы на карысць адразу трох варожых разведак! Арыштавалі ў лістападзе 1937-га. Следства было нядоўгім, і ўжо 13 студзеня 1938 года І. Варановіча расстралялі ў Бабруйску.

Справядлівасць была адноўленая толькі ў 1957 годзе, калі трыбунал Беларускай ваеннай акругі адмяніў пастанову «тройкі» ад 9 снежня 1937 года па справе І. Варановіча і апраўдаў яго... «з-за адсутнасці складу злачынства».

Мікалай ШУКАНАЎ,
супрацоўнік жлобінскай райгазеты «Новы дзень», краязнавец

Іранізмы ў п'есах Максіма Гарэцкага

(Заканчэнне. Пачатак у № 6)

Драматызаваны абразок «Мутэрка». З іранізмамі сустракаемся ў некаторых рэпліках Мутэркі, звернутых да ўдавы Блюмы Ліпскай: *Знайшла чым наставіцца, ха-ха-ха! Правільна, Блюма, ты не такая бедная, каб свайму* ***«ка-ха-нку»*** *купляць такую смярдзючую табаку, як гэтая варшайская дрэнь; Адным словам, мадам Ліпская,* ***«палю-боў-нік»*** *вам каштуе надта дорага. Я дасканальна разумею вас і шчыра спачуваю вам. Ха-ха-ха!* Іранічная афарбоўка, якую набываюць назоўнікі *каханак* і *палюбоўнік*, выяўляецца з дапамогай дэфіснага напісання слова і двукосся. У ролі паказчыка выступае і кантэкст, з якога вядома, што пачуцця кахання да Ліпскай Мутэрка не мае. Ролю палюбоўніка ён выконвае дзеля задавальнення сваіх карыслівых інтарэсаў, бо Блюма Ліпская – багатая местачковая крамніца. Дарэчы, у другой рэпліцы іранічнае адценне ўкладваецца і ў слова *шчыра* (спачуваю вам), пра што сведчыць постпазіцыйны вербальны паказчык – гукапераймальны выклічнік *ха-ха-ха!*

Мутэрка прызнаецца Ліпскай, што *з* «такім трудам далася мая цяперашняя расейская мова, што пісаваць яе, выбачайце, ніколі не згоджуся!» З едкай іроніяй успрымаюцца гэтыя і іншыя «прызнанні» «чыстага русака», які разыгрывае ролю прыстойнага грамадзяніна, дакарае сябе, што з-за кахання «пагрэбаваў (на нейкі час) служэннем свайму народу і заняўся прыватнымі лекцыямі сярод месцячковых буржуйчыкаў». На словы Ліпскай «А некаторыя ж вашы вучыцялі ўжо адчынілі школы і вучаць па-беларуску» Мутэрка-«патрыёт» спачатку нібы са шкадаваннем, а потым, кіруючыся чыста ўласнымі выгодамі, не без іроніі, а то і сарказму, адказаў ёй: *З аднаго боку, немаведама, як у іх пойдзе. З другога боку, схадзіць з галавы нікому забараніць не можна, – так! А калі чалавек хоча жрр-аць, ён будзе вам вучыць не толькі па-беларуску, а хоць бы пакітайску.*

Драматычны абразок «Жартаўлівы Пісарэвіч». Іранічную афарбоўку набываюць словы, якія ўжываюцца як адмысловая («разавая») назва персанажа: **[**Жонка (збітая з раўнавагі)**:]** *Дык гэта ж і ёсць сам пан Пшэпюркоўскі, лекар бяжэнскага камітэту.* [Пісарэвіч:] *А-а?! А чаму ж ты з ім не пазнаёмілася? Знаёмы і сам уцякач, гэта ж:* ***"Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся"****.* [Вылучаны выраз Пісарэвіч выкарыстоўвае ў дачыненні да лекара «*бяжэнскага камітэту*», які, мабыць, нярэдка карыстаўся гэтым адным з першых самых вядомых камуністычных лозунгаў (ням. «*Proletarier aller Lander, vereinigt euch!*»; упершыню быў выказаны Карлам Марксам і Фрыдрыхам Энгельсам у «Маніфесце Камуністычнай партыі»).

У функцыі іранізму ўжываецца перыфраза-эўфемізм, якая кампанентным складам камічна намякае на прамую назву: [Баба (прыбягае раз'юшаная):] *Зладзеі вы! З-пад чужой курыцы яйкі выбіраеце ды яешні сабе смажыце! Падумаеш, паны дужа вялікія!* [Жонка:] *Алесь, галубок, даражэнькі! Яна брэша, няпраўда, я не брала, я на рынку купіла...* (Тупіць вочы, уцягвае галаву.) [Баба:] ***Купіла пад чужой курыцай!*** Тут вылучаная перыфраза ўжываецца са значэннем 'забрала з-пад чужой курыцы'.

На эфекце «падманутага чакання» пабудаваны наступны дыялог: спачатку Пісарэвіч як бы згаджаецца з Пані («Выбачайце: тут мяшкаюць панства Пісарэвічы?»): *Тут, тут...* Аднак далейшы працяг ягонай рэплікі сведчыць пра адваротнае: «...хоць якое там панства! **Быў конь, ды з'ездзіўся»**. Без скаргі, не адкрыта, а неяк прыхавана, у вобразнай форме, з дапамогай вылучанай прыказкі (гаворыцца пра таго, хто састарыўся ці страціў сваё былое значэнне, уплыў і пад.) Пісарэвіч даў зразумець Пані, хто ён ёсць насамрэч – нямоглы, пазбаўлены свайго жылля, гаспадаркі... Горкая самаіронія ўкладзеная «панам» Пісарэвічам у сэнс ужытай ім прыказкі.

З іранічным адценнем успрымаецца ацэнка-пахвальба Пісарэвічам сваіх хлопчыкаў: *Мае хлопчыкі? А нічога, нічога, дзякую! Аддалі былі іх у прытулак, – хоць Стася і дужа не хацела, але крута нам прыйшлося. Дык нічога! Красці троху няліся там, наўчыліся ад сяброў, а цяпер во з намі жывуць, бо прытулак зачыніўся, – нічога, добрыя хлопчыкі...* Паказчыкам іранічнага ўжывання словазлучэння *добрыя хлопчыкі* з'яўляецца прэпазіцыйны вербальны кантэкст – *красці троху няліся там, наўчыліся ад сяброў.*

Як іранізмы ўспрымаюцца радкі, якія неаднойчы спяваў Пісарэвіч дзеля суцяшэння сваёй і людской нядолі, – заключныя словы 1-й страфы міжнароднага пралетарскага гімна «Інтэрнацыянал» (1871) французскага паэта-песенніка Эжэна Пацье:

[Пісарэвіч:] *Быў конь, ды з'ездзіўся. Ну, нічога! Добра, усё добра!* (Пяе, махаючы ад сцюжы рукамі – ботам і шылам.)

Хто быў нічым,
Той будзе ўсім!

[Пісарэвіч (прыходзіць, пеючы **«Хто быў нічым...»**):] *А што, пайшла ўжо гэтая лялька* [маладая, досыць прыгожая пані Ядвіга]*? Няўжо і да сябе запрасіла?* [Жонка (халяруе):] *Змоўкні, змоўкні, змоўкні з гэтаю песняй! Ты ненармальны!*

Пра дасціпнасць Пісарэвіча, здольнасць яго пра жыццёвыя нягоды сказаць не адкрыта, а іншасказальна, сведчыць наступны дыялог: [Пісарэвіч:] *Промысел – чым мы будзем жыць і што мы будзем есці. Але, грамадзянка, не стойце ў дзвярах, праходзьце далей у нашы палацы!* [Пані (нясмела заходзіць):] *А хто вы такі? Ці сапраўды тут жывуць панства Пісарэвічы?* З папярэдняй разгорнутай рэмаркі вынікае, што «*нашы палацы*» – гэта сцюдзёная нямалёная марознай зімою кватэра.

Драматызаваная аповесць «Антон». Паказчыкам іранічнага ўжывання моўнай адзінкі з'яўляецца спецыялізаваная рэмарка *насмешліва*: [Антон (дос касіць, выцірае лоб рукавом):] *Ат, будзе з нас, тата, перакашу няўмысля, дагледзіць Банадысёнак – сварыцца пачне...* [Аўтух:] *А глядзець на яго сваркі? Няхай сабе горла дзярэ, а ты – сваё адкасіў, і ніхто да цябе нічога не мае. Адкасі цяпер жа...* [Антон:] *Ну, дадушы, тата, будзе сварка... Клок тут сена, бярэмца не збярэцца... Мяжа, здаецца, так ідзе.* [Аўтух (насмешліва):] ***Жалобнік*** *ты ў мяне абабраўся... Дурань! Пакінь з аднаго боку Банадысю на паўпакоса ды Ахрэму з другога столькі, і касіць не трэба, бо рэз шырокі, што там...* Відавочна, што Аўтух іранізуе з сына («Жалобнік ты ў мяне абабраўся...»), калі той, звяртаючыся да бацькі, просіць яго: *Ат, будзе з нас, тата, перакашу няўмысля, дагледзіць Банадысёнак – сварыцца пачне...*

Пра іранічнае ўжыванне прыметніка *добранькі* (Аўтух) сведчыць постпазіцыйны вербальны кантэкст – развіты прыдатак *сабака панскі, абдзірала...*: [Якаў:] *Ладзен, ладзен ён, твой* ***добранькі*** *Аўтух, сабака панскі, абдзірала... Паліцыя няхай возьмецца яшчэ, не падаруецца яму...*

Іранічны эфект можа выяўляцца з дапамогай камбінаваных сродкаў –рэмарак *насміхаючыся, рагоча*, а таксама фрагментаў рэплікі Іцкі: [Ёсель (прыносіць гарэлку):] *Аўтух, Аўтух, а ў пані ты даўно быў. Аддала пенсію!* [Іцка (насміхаючыся):] ***Аддадуць****. Паня Іванецкая аддае на лета, ды не на гэта...* (Рагоча.) *Каб у яе было што аддаваць. Лясы прадае, прадасць і зямлю... Тады аддасць...* Пачуўшы ад Ёселя, які звярнуўся з пытаннем да Аўтуха, ці аддала пані пенсію, Іцка, не дачакаўшыся адказу, з іроніяй (паказчык – прэпазіцыйная рэмарка *насміхаючыся*) адказаў: *аддадуць*. Функцыю постпазіцыйнага вербальнага паказчыка камічнага і адначасова ягонага інтэнсіфікатара выконвае фрагмент Іцкавай рэплікі *паня Іванецкая аддае на лета, ды не на гэта...* (Рагоча.). І абгрунтоўвае адказ: *Каб у яе было што аддаваць*.

Такім чынам, у драматургічных творах М. Гарэцкага іранізмы не толькі служаць для стварэння камічных сцэнаў, але і з'яўляюцца (што не менш важна) дзейсным сродкам характарыстыкі адмоўных персанажаў – духоўна ўбогіх мясцовых «інтэлігентаў», якія выракліся сваёй роднай мовы, блізкіх...

Васіль РАГАЎЦОЎ

Рэха падзеі

Уражанні ад вандраванняў па кніжным моры

Цягам пяці дзён з 6 па 10 лютага ў беларускай сталіцы можна было з асалодай павандраваць па сапраўдным кніжным моры, прычаліць да любога з яго 25 астравоў – стэндаў краінаў-удзельніцаў XX Міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Найбольш буйныя астравы, акрамя Беларусі, традыцыйна займалі Расія, Францыя і Германія. Ганаровы госць сёлетняй выстаўкі – Расія, якая прадставіла каля 2 тысячаў найменняў кніг амаль 200 выдавецтваў.

Выставачная прастора павільёна «БелЭкспо» пад час выстаўкі стала не толькі пляцоўкай дэманстрацыі кніжных навінак і сустрэчаў творцаў з чытачамі, але

Віктар Шніп, Пётр Жаўняровіч і Анатоль Верабей прадстаўляюць шматтомнік Уладзіміра Караткевіча

і месцам падвядзення вынікаў года ў кнігавыдавецкай справе, дэманстрацыі дасягненняў, міжнароднага абмену досведам у сферы кніжнага бізнэсу. У насычанай праграме былі прэзентацыі праектаў нацыянальнай праграмы «Сям'я – Яднанне – Айчына», літаратурныя сустрэчы і канцэрты народнай і духоўнай музыкі, шматлікія кніжныя майстаркласы ад прафесіяналаў каледжа паліграфіі. Мерапрыемствы ладзіліся таксама ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Доме літаратараў і, нават, у клубе LOFT.

Урачыстае адкрыццё юбілейнай выстаўкі праходзіла з традыцыйнымі прамовамі афіцыйных асобаў і перапаразаннем чырвонай стужачкі пад гукі аркестра «Няміга». Гасцінныя гаспадары сустракалі шаноўных гасцей адмысловым



Уладзімір Ліхадзедаў і ягоныя кнігі

караваем, які падрыхтавалі сталічныя хлебапёкі. На жаль, наведніку-беларусу не пашанцавала знайсці родную мову ні ў афіцыйнай назве выстаўкі, ні ў дэвізе. Хаця паводле афіцыйных дадзеных колькасць выдадзеных па-беларуску кніг узрасла і дасягнула аж 12 адсоткаў (!) у агульным тыражы. Затое кожны ахвочы мог прыйсці на прэзентацыю разнастайных выданняў на роднай мове, задаць пытанні іх творцам і атрымаць аўтограф аўтара.

Прэзентацыі знакавых кніжных навінак беларускага кнігадруку праходзілі на сумесным стэндзе Мінінфармацыі. Пачэсны першы нумар у гэтым спісе дастаўся найстаражытнейшаму помніку кніжнай культуры Беларусі, які захоўвае адбітак гаворкі крывічоў, факсімільнаму выданню Полацкага Евангелля, першаму з найбольш захаваных сярод дзясятка Евангелляў, створаных ці знойдзеных на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Выданне здзейсненае дзякуючы глабальнаму праекту «Вяртанне святыняў» выдавецтва Беларускага Экзархата і Міжнароднага дабрачыннага фонду падтрымкі міжнароднага праекта «Сям'я – Яднанне – Айчына». Да выдадзеных раней «Слуцкага Евангелля» і «Жыціі блажэннай Еўфрасінні...» далучаны чарго-

Тамы пра традыцыйную культуру Палесся прадстаўляюць Мікола Козенка, Тамара Варфаламеева і Таццяна Валодзіна

Да мастацкіх альбомаў рэпрадукцыяў Івана Хруцкага, Валенція Ваньковіча, Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Язэпа Драздовіча (што выйшлі раней) дададзеныя альбомы Станіслава Жукоўскага і Віталя Цвіркі.

Шыкоўным падарункам стаў выхад з друку ў выдавецтве «Беларусь» чарговай працы калектыва аддзела старажытнабеларускай культуры былога Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі пад кіраўніцтвам Барыса Лазукі «Помнікі мастацкай культуры Беларусі». У альбоме змешчаныя падрабязныя звесткі пра помнікі, якія з'яўляюцца экспа-

Прэзентацыя кнігі «Полацк. 1150»

ра Караткевіча, першага тома Івана Навуменкі, залатой калекцыі беларускай паэзіі і прозы XX і XXI стагоддзяў. Выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі», якое ўтрымлівае пазіцыі падрыхтоўкі грунтоўных выданняў, парадавала аматараў кнігі сваімі навінкамі: «Полацк. 1150», «Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава 1911–1912 гадоў», «Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI стагоддзя», «Сучасная геральдыка Беларусі», «Ваньковічы» (першая кніга з серыі «Беларускія радаводы»), «Белорусы Москвы, XVII век», «Кніжная культура. Ветка», «Сучаснае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. XXI стагоддзе».

Новую серыю кніг «Славутыя мастакі з Беларусі» распачало выдавецтва «Беларусь».

натамі Музея старажытнабеларускай культуры. Значная частка матэрыялаў апублікаваная ўпершыню. Навукова-папулярнае выданне цудоўна аформленае, таму зацікавіць не толькі беларускіх чытачоў, але і замежных гасцей.

Цудоўным працягам і дадаткам распрацоўкі тэмы беларускай культуры, ужо яе нематэрыяльнай спадчыны, з'яўляецца выданне шостага тома ў дзвюх кнігах «Традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў. Гомельскае Палессе і Падняпроўе», што выдала «Вышэйшая школа». Яе можна аднесці да ўзораў «вышэйшага пілатажу» паводле распрацоўкі тэмы. Гэтае грунтоўнае навуковае выданне калектыва навукоўцаў-фалькларыстаў НАН Беларусі пад кіраўніцтвам Таццяны Варфаламеевай змяшчае падрабязнае апісанне святаў, звычаяў, абрадаў традыцыйнага гадавога кола палешука, а таксама песеннай, танцавальнай і інструментальнай музычнай культуры. Да выданняў прыкладзеныя дыскі з аўдыя- і відэаматэрыяламі. Акрамя навуковай значнасці, кніга з'яўляецца жывым своеасаблівым помнікам носьбітам, якія ўжо пакінулі гэты свет. Але, дзякуючы апантаным рупліўцам і патрыётам нацыянальнай культуры, сапраўдныя перліны карэннай культуры Бацькаўшчыны паспелі захаваць для нашчадкаў.

За некалькі дзён кніжнага форуму было нямала падзеяў, таму мы яшчэ не раз вернемся ў «плаванне» па тым моры кніжных навінак.

Наш кар.
Фота
Наталі Купрэвіч

Выдавецтва «Чатыры чвэрці» і яе дырэктар Ліліяна Анцух

Дранікі

За вакном зіма. Бязважкія сняжынкі павольна кружляюць у паветры і пакрываюць пухкім дываном лёд хакейнай пляцоўкі ў двары школы. Дворнік дзядзька Слава чэрціць роўныя лініі вялікім драўляным шуфлем – прыбірае снег. Настаўніца фізікі ў класе нешта доўга тлумачыць каля дошкі і таксама чэрціць. Рукавы яе новага шэрага касцюма брудныя ад крэйды. Час ператварыўся ў доўгі гумовы жгут: усё цягнецца, цягнецца. Сумна і вельмі хочацца есці.

Заўсёды такі нечаканы званок падкідвае і, кажучы мову дакладных навук, надае паскарэнне. Холадна, але ляніва бегчы ў раздзявальню па паліто. Выбягаем на вуліцу: пасля душнага класа лёгкія напаўняюцца марознай свежасцю, а душа бесшабашнай весялосцю і п'янкім пачуццём свабоды. Яркае зімняе сонейка слепіць вочы. Прарваўшыся праз снежкі і смех старшакласнікаў, хутка бяжым па галалёдзе да майго лепшага сябра Змітра, які жыве непадалёк у маленькім драўляным дамку. У адным пакойчыку і невялічкай куханьцы туліцца ўся яго вялікая сям'я.

Маці Змітра – актрыса тэатра юнага гледача. Яе амплуа – добрыя звяры і маленькія дзяўчынкі. Раз на месяц яна здабывае кантрамаркі, і мы са Змітром трапляем у казачны свет тэатра. Сядзім звычайна ў першых радах і з нецярпеннем чакаем заканчэння спектакля, каб хутчэй патрапіць за кулісы, дзе маленькія і незаўважныя раптам становяцца вялікімі, а вялікія – смешнымі.

Бацька Змітра – інжынер (ён працуе ў нейкім страшна сакрэтным НДІ). Добры і ціхі чалавек, я б сказаў, незаўважны. Ён грае на гітары і выразае з дрэва розныя непатрэбныя рэчы, якімі заваленыя ўсе шафы і антрэсолі. З імі яшчэ жывуць маленькая шкадлівая сястрычка Машка і дзядуля, некалі заслужаны ўрач у адным з гарадкоў.

У сябра дома шмат цікавага: калекцыя манетаў, значкоў і старых кніг. На сцяне вісяць старая іржавая шабля, планшэткі і партупеі. У доме пануе творчы беспарадак.

Як толькі мы ўлятаем з марозу ў цёплую кухню, маці Змітра адразу ж камандуе: «Рукі!». Мыемся халоднай вадою ў старым аблупленым рукамыйніку, што стаіць у куце, і сядаем за стол. У вялікай эмаляванай місцы ўжо нацёртая бульба, дададзеныя мука, яйка, крыху цыбулі і соль. Маці сябра вострым нажом хутка наразае кавалкі белага сала і кідае на гарачую патэльню. Сала пачынае сквірчэць і плавіцца, а па кухні разлятаецца апетытны пах. Жанчына паглядае на гадзіннік і ўсміхаецца, згубіла ўвагу і тут жа апякла палец. Хуценька падносіць яго да мочкі вуха, вохкаючы, падстаўляе руку пад халодную ваду. Выцірае рукі аб фартух – спяшаецца. Мы са Змітром сядзім і ўважліва сочым за кожным яе рухам, чакаем сваёй порцыі.

На патэльню трапляе першы дранік, ён пузырыцца, шыпіць і пакрысе становіцца залатым. Маці Змітра хутка яго пераварочвае і кідае на талерку – першая порцыя гатовая. Апускаю гарачы дранік у густую смятану, дзьмухаю. І хоць ем патрошку, але ўсё роўна апякаю язык. Сказаць, што гэта было смачна, нічога не сказаць – гэта было незабыўна!

Хоць мы даўно выраслі, а Зміцер стаў вайскоўцам і жыве недзе далёка ў суседняй краіне, думаю, што і ён часамі ўзгадвае смак тых дранікаў з далёкага дзяцінства.

Сяргей ЛІХТАРОВІЧ



Краязнаўства на беларускіх землях у перыяд Расійскай імперыі (1772/1795 – 1917 гг.)

Развіццё краязнаўчага руху ў 1772/1795 – 1864 гг.

Сучасны даследчык «Скарбніцы граматаў» В.Ф. Голубеў адзначыў каштоўнасць апублікаваных у выданні матэрыялаў, іх значэнне для вырашэння «чыста гістарычных пытанняў», а не для абслугоўвання ідэалагічнага заказу, якімі былі выданні архіўных дакументаў, здзейсненыя па загадзе ўладаў пасля паўстання 1863–1864 гг. Але пасля паўстання рэпрэсіўныя дзеянні ўладаў прывялі да разгрому Віленскага музея старажытнасцяў і археалагічнай камісіі. Яўстах Тышкевіч, зняважаны і пазбаўлены справы свайго жыцця, у хуткім часе памёр.

Дзяржаўнае краязнаўства ўзнікла і развівалася на аснове патрэбаў цэнтральных і рэгіянальных органаў улады і кіравання ў інтэграванні беларускіх зямель у грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя працэсы развіцця Расійскай імперыі. Яго суб'ектамі было даволі шырокае кола ўстановаў і арганізацыяў, у функцыі якіх уваходзіла атрыманне мясцовай інфармацыі і яе выкарыстанне ў разнастайных мэтах. У іх ліку былі ВНУ, губернскія статкамітэты, архівы.

У імператарскім Віленскім універсітэце (1803–1832), Полацкай езуіцкай акадэміі (1812–1820), Горы-Горацкім земляробчым інстытуце (1840–1848 – школа; 1848–1864 – інстытут) пачаліся гістарычныя, гісторыка-літаратурныя, моўныя, прыродазнаўчыя і іншыя даследаванні беларускіх зямель.

На 1815–1824 гг. прыходзіцца росквіт дзейнасці імператарскага Віленскага ўніверсітэта як навуковай і навучальнай установы. Пад кіраўніцтвам рэктара Я. Снядэцкага была палепшаная матэрыяльна-тэхнічная база, ствараліся новыя кафедры, расквітнелі крыніцазнаўчыя гістарычныя і моўныя даследаванні, прысвечаныя ВКЛ. Яго выпускнікі ў Заходнім краі працавалі ўрачамі, юрыстамі і іншымі спецыялістамі. Універсітэт кіраваў школьнай сістэмай адукацыі, быў на чале Віленскай навучальнай акругі. Універсітэцкая адукацыя стала вельмі каштоўнай. Для незаможных слаёў універсітэт адкрываў дарогі навукі, прафесійнай дзейнасці, паляпшэння дабрабыту. Ва ўніверсітэце вучыліся дзеці багатых шляхціцаў, якіх не цікавіла кар'ера чыноўнікаў. Неабходна асобна адзначыць надзвычую з'яву, якая заключалася ў высокім уплыве ўніверсітэта на грамадскую свядомасць адукаваных колаў Беларусі, Літвы і Польшчы. Польскія гісторыкі прызнаюць, што ніколі да сённяшніх дзён ні адна ВНУ не мела падобнага грамадскага ўплыву. Гэта стала магчымым дзякуючы выдатнаму прафесарскаму складу і патрыятычнай пазіцыі выкладчыкаў, выхадцаў з беларускіх зямель І. Даніловіча, М. Пелкі-Палінскага, М. Бароўскага, С.Б. Юндзіла, І. Анацэвіча і інш. Асабліва актыўным у розных грамадскіх пачынаннях быў ад'юнкт бібліятэкі ўніверсітэта, ураджэнец Вілейскага павета К. Контрым. Прафесары Віленскага ўніверсітэта ўнеслі значны ўклад у гістарычнае краязнаўства.

Першы даследчык беларуска-літоўскага летапісання і права ВКЛ прафесар Ігнат Даніловіч (1787–1843) згуртаваў маладых даследчыкаў, выхадцаў з сыноў беларускіх уніяцкіх святароў, якія добра ведалі царкоўнаславянскую, беларускую, польскую, лацінскую і іншыя мовы, абудзіў у іх жаданне да пошуку, патрыятызм. Гэта былі М. Баброўскі, І. Анацэвіч, П. Сасноўскі, А. Марціноўскі і інш.. Яны дапамагалі І. Даніловічу праводзіць пошук матэрыялаў. Ён супрацоўнічаў таксама і з І. Лялевелем, В. Анастасевічам, М. Румянцавым. І. Даніловіч быў вядомым вучоным: ва ўніверсітэтах Расіі яму былі даступныя архівы, музеі, розныя калекцыі і зборы. У Супрасльскім манастыры ён адшукаў выдатны помнік беларуска-літоўскага летапісання «Супраслеўскі летапіс». Марай І. Даніловіча было адрадзіць да жыцця старажытную беларускую мову. Аднак патрыятычныя настроі, якія распаўсюджваў сваёй дзейнасцю І. Даніловіч, пачалі варожа ўспрымацца расійскімі ўладнымі структурамі як «мятежные». За вучоным пачалі сачыць, арганізавалі траўлю, і ў 1824 г. І. Даніловіч пераехаў на працу ў Кіеўскі ўніверсітэт. Пераадольваючы горкія перапетыі лёсу, ён настойліва займаўся даследаваннямі, рыхтаваў вялікі зборнік дакументаў. На жаль, хвароба і смерць перашкодзілі выдаць практычна завершаную працу. Рукапіс яго набыў і выдаў Віленскі музей старажытнасцяў пад назваю «Скарбніца граматаў» (1860–1862) з захаваннем прозвішча складальніка.

Крыніцы, сабраныя выхаванцамі і выкладчыкамі Віленскага ўніверсітэта, адлюстроўвалі сістэму самакіравання, якую на працягу многіх стагоддзяў мелі беларускія рэгіёны, іх гісторыю, стан гаспадаркі, адметнасці ў рэлігіі, падзеі маскоўска-літоўскіх войнаў, гісторыю сем'яў. Многія дакументы былі вельмі непажаданыя ў вачах уладаў, не адпавядалі міфам аб вечнай прыналежнасці беларусаў да Расіі. Невыпадкова ўлады імкнуліся развіваць публікацыю такіх дакументаў, якія б больш адпавядалі афіцыйнай палітыцы ў дачыненні да Літвы-Беларусі. З пазіцыяў афіцыйнай ідэалогіі публікацыю гістарычных актаў здзейсніў мінскі цывільны губернатар А. Сямёнаў «Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам» (1848).

Выдатныя выкладчыкі аказалі значны ўплыў на фармаванне патрыятычных настрояў студэнцтва. У студэнцкім асяроддзі, паводле словаў Т. Зана, «сялянская» (беларуская) мова ўжывалася ахвотна. Захапленне беларускім фальклорам, зварот да яго ў літаратурнай творчасці пракладала шляхі для ўздыму краязнаўства.

Прафесары і студэнты Полацкай езуіцкай акадэміі выканалі падрабязнае апісанне Полацка, гісторыі Віцебскага і Полацкага краю. Вынікі адлюстроўвалі ў часопісе «Месячнік Полацкі».

Узніклая ў Горках земляробчая школа, з 1848 г. была ператвораная ў Горы-Горацкі земляробчы інстытут, які рыхтаваў аграномаў. Пры інстытуце былі музеі: заалагічны, анатамічны, сельскагаспадарчых машын, батанічны сад (3 870 раслінаў), бібліятэка – больш за 7 000 тамоў. Выкладчыкі Сцебут, Бажанаў, С. Касовіч і іншыя займаліся рэгіянальнай агратэхналогіяй; іх вынікі знайшлі адлюстраванне ў «Запісках Горы-Горацкага земляробчага інстытута» (1852–1857). За ўдзел выкладчыкаў і студэнтаў у паўстанні 1863–1864 гг. інстытут быў праведзены ў Санкт-Пецярбург.

На ніве школьнай адукацыі пэўны перыяд працавалі каталіцкія ордэны. Але гэтыя школы не выклікалі даверу ўладаў, і іх закрыццё было прадвызначанае. Фармавалася сетка навучальных установаў, уласцівая расійскай сістэме адукацыі, у прыватнасці, гімназіі. Захаваліся звесткі аб краязнаўчай працы асобных навучальных установаў. Так, у 1837 г. выхаванцы Себежскай гімназіі вялі запісы народных абрадаў, легендаў і песень.

У гэты перыяд узнік шэраг дзяржаўных інстытутаў, функцыянаванне якіх непасрэдна было звязанае са зборам і апрацоўкай мясцовай інфармацыі, але асноўная іх дзейнасць разгарнулася ў наступны перыяд. Гэта найперш губернскія статыстычныя камітэты (статкамітэты), Віцебскі і Віленскі архівы старажытных актавых кніг. Губернскія статкамітэты пачалі ўтварацца па загадзе Сената ў 1834 г. Асноўнай іх задачай быў збор і абагульненне рэгіянальных статыстычных звестак аб гаспадарцы і насельніцтве.

Па заданні Генштаба расійскай арміі з мэтамі ваенна-стратэгічнага характару было праведзенае вывучэнне беларускіх зямель. Збор звестак быў даручаны афіцэрам, ураджэнцаў заходніх губерняў. Хаця дакладнага плана збору матэрыялу аб «присоединённых территориях» не было, яны збіралі разнастайны матэрыял, які ў сукупнасці найбольш дакладна адлюстроўваў асаблівасці таго ці іншага рэгіёну. Паходжанне дапамагала афіцэрам атрымаць звесткі з сямейных архіваў, прыватных музеяў і бібліятэк. Пад агульнай назвай «Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба» пачалі выдавацца гістарычна-статыстычныя апісанні губерняў: Віленскай, падрыхтаванае А. Карэвам, Гродзенскай – П. Баброўскім, Мінскай – І. Зяленскім. Лепшай з іх з'яўляецца праца П. Баброўскага. Пад яе ўплывам Баброўскі захапіўся краязнаўствам, надрукаваў каля 80 навуковых працаў па гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі «роднага яму Паўночна-Заходняга краю».

Валянціна САІТАВА

(Працяг будзе)

Працяг тэмы. Пачатак у №№ 21–23, 34–36, 42–44 за 2012 год, №№ 2–6 за 2013 год.

... і працуйце без турботаў

Штогод паўтараецца карціна пажараў на будаўнічых пляцоўках, мяняюцца толькі лічбы. Парушэнні на розных будпляцоўках падобныя, як браты-блізняты: развядзенне вогнішча для спальвання смецця ці разагрэву бітуму, эксплуатацыя ў бытоўках і вагончыках самаробных абагравальнікаў, інш. Электраправодка амаль паўсюль пракладваецца наспех, часта без ізаляцыі і па гаручым падмурку. Лямпачкі нярэдка пакідаюцца без плафонаў, а ў шчытках замест засцерагальнікаў выкарыстоўваюцца «жучкі». На большасці будпляцовак адсутнічаюць сродкі тушэння пажару: шчыты з рыдлёўкамі, баграмі, вогнетушыцелямі, а таксама звычайныя скрыні з пяском.

Але не апошні і чалавечы фактар. Як вядома, у бытоўках і вагончыках забаронена заставацца пасля заканчэння працоўнай змены, курыць і распіваць спіртныя напоі. Менавіта гэтыя правілы будаўнікі не заўсёды выконваюць.

Няма сэнсу паўтараць азбучную ісціну, што пажар прасцей папярэдзіць, чым тушыць. Таму кожны мусіць памятаць, што адным з самых дзейсных метадаў, як паказвае шматгадовая практыка, з'яўляецца выкананне элементарных правілаў пажарнай бяспекі.

Вольга ЦЫНКЕВІЧ, інспектар ЦРАНС г. Мінска

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 6

Уздоўж: **1.** Мяцеліца. **5.** Асветнік. **10.** Кароўніца. **11.** Сват. **13.** Вада. **14.** Мірт. **16.** Лета. **18.** Іней. **19.** Стык. **21.** Лыжы. **23.** Егер. **25.** Стрэчанне. **29.** Асцярога. **30.** Эстакада.

Упоперак: **1.** Максім. **2.** Цела. **3.** Лак. **4.** Цар. **6.** СМІ. **7.** Ежа. **8.** Неба. **9.** Кашара. **12.** Тутэйшы. **13.** Валоссе. **15.** Іон. **17.** Тры. **18.** Ігліца. **20.** Карова. **22.** Жрэц. **24.** Гута. **25.** Сыр. **26.** Рог. **27.** Нос. **28.** Ева.

Жарт тыдня ад Каласка і Калінкі

Сядзяць тры бабы на лавачцы. У кожнай – свой клопат.

– Вой, калінкі, у мяне карову ўкралі.

– А ў мяне – гадзіннік.

Трэцяя пазірае на гадзіннік, раздумвае:

– Так, колькі часу?.. Пара даіць карову...

У Аўцюках кажуць: «Каб знайсці анекдот, трэба пахадзіць па бабах».

У тэатры «Зьніч»

27 лютага Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра «Зьніч» запрашае на паэтычна-музычную імпрэзу **«І сэрцу, і душы»** (класічная музыка XIX–XX стст.), прымеркаваную да 100-годдзя Сяргея Грахоўскага. Яна адбудзецца ў межах тэатральна-канцэртнага праекта «Час і постаці».

У вечарыне возьмуць удзел Таццяна Шумакова (цымбалы), Уладзімір Рагаўцоў, Леанід Сідарэвіч, Галіна Дзягілева, Наталля Сазановіч (фартэпіяна).

Імпрэза адбудзецца ў Малой зале імя Рыгора Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі а 19-й.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

МІНІЯЦЮ́РА (франц. *iniature*, італьян. *miniatura* ад лац. *minium* кінавар, сурык, якімі ў старажытнасці размалёўвалі рукапісныя кнігі) – мастацкі твор малых памераў.

Адну з асноўных галінаў мастацтва мініяцюры складае кніжная – зробленыя ад рукі малюнкі, шматколерныя ілюстрацыі гуашшу, клеявымі, акварэльнымі і інш. фарбамі ў рукапісных кнігах, а таксама выяўленча-дэкаратыўныя элементы афармлення гэтых кніг – ініцыялы, застаўкі і інш. На нашых землях аздабленне вядомае ўжо ў X–XIII стст. (аздобы Супрасльскага рукапісу, Тураўскага, Аршанскага Евангелляў, Хутынскага служэбніка). У XIV ст. развіваўся тэраталагічны стыль, найбольш выразны ў ініцыялах Мсціжскага Евангелля, Полацкім Евангеллі (XIII–XIV стст.), Анежскім псалтыры (1395).

У 2-й пал. XIV–XVI стст. у беларускай мініяцюры ўзмацніўся заходнееўрапейскі ўплыў: праніклі свецкія сюжэты, гістарычныя і побытавыя сцэны (Лаўрышаўскае, Жыровіцкае, Шарашоўскае Евангеллі, Радзівілаўскі летапіс). У XVII–XVIII стст. на мініяцюру ўплывала гравюра друкаваных кніг.

Вядомыя імёны перапісчыкаў кніг і мастакоў Паповіча Бярозкі з Наваградка, Юрыя Алелькі (ці Алелькавіча) са Слуцка, Стэфана Кахановіча з Супрасля, Васіля Амельяненскага з Віцебска, Яўстафія з Гродна, Парфёна з Пінска. У цэлым для беларускай мініяцюры характэрныя жыццёвасць і экспрэсія вобразаў, стрыманы дэкор, сакавітасць каларыту, жанравы характар ініцыялаў.

У жывапісе мініяцюры вызначаюцца асабліва тонкай манерай накладання фарбаў. У XVIII–XIX стст. мініяцюрныя партрэты, выкананыя на пергаміне, слановай косці, метале ці фарфоры, часта змяшчаліся на медальёнах, табакерках, ордэнах. Зберагліся мініяцюрныя партрэты Пятра I, рускіх імператрыцаў Ганны Іаанаўны і Кацярыны I, выкананыя выхадцам з Беларусі Р. Мусікійскім, а таксама партрэты А. Міцкевіча, А. Сапегі. У Беларусі ў лакавай мініяцюры можна назваць майстроў Г. і А. Осіпавых, В. і А. Ражковых.

Асвячэнне Сафійскага сабора ў Полацку, мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

«Цар Давід іграе на гуслях, а птушкі і скаты слухаюць», мініяцюра з Тлумачальнага псалтыра XVI ст.

У літаратуры – невялікі кампазіцыйна завершаны твор, у якім кандэнсуецца значны змест, выяўляецца тэндэнцыя да сцісласці і шырыні абагульнення. Мініяцюра, асабліва паэтычная, блізкая да афарыстычнага выказвання. Напрыклад, у Максіма Танка: «Ад гора – усё ў свеце няміла, // Ад шчасця – час хутка мінае, // Ад хмелю – марнуюцца сілы, // Ад славы – сяброў убывае... // Вось тут і спыніся на нечым // У гэтым жыцці, чалавеча!». Жанравыя прыкметы выразна змешваюцца ў празаічных мініяцюрах: лірычных замалёўках, абразках, паэтычных рэфлексіях у прозе (творы М. Гарэцкага, Змітрака Бядулі, Янкі Брыля, Ф. Янкоўскага). Эмацыйны, суб'ектыўна-лірычны пачатак тут арганічна ўзаемадзейнічае з эпічна-канкрэтным (напрыклад, у А. Карпюка). Такія мініяцюры маюць жанравыя рысы эсэ. Вершаваныя мініяцюры – пераважна лірычныя творы, складаюцца звычайна з 2–6 радкоў. Сустракаюцца ў М. Багдановіча, У. Дубоўкі, Л. Геніюш, Р. Барадуліна, Я. Сіпакова, Ю. Свіркі, Р. Тармолы-Мірскага, А. Разанава і інш. Да мініяцюраў адносяць і такія ўстойлівыя формы паэзіі, як карацелька, рубаі, прыпеўкі, каламыйкі, фрашкі. Драматургічная мініяцюра – сцісłая сцэнка, найчасцей камедыйна-сатырычны твор, у якім дзейнічаюць 2–3 персанажы.

У музыцы – музычная п'еса, найчасцей для фартэпіяна, а таксама інш. музычных інструментаў, для камерных ансамбляў, аркестраў і інш. Характэрныя рысы – малы маштаб, лаканічнасць формы (звычайна простыя 1-, 2- і 3-часткавыя формы), тонкая дэталізацыя прыёмаў пісьма, аб'яднанне асобных п'есаў у цыклы. У беларускіх кампазітараў шырока прадстаўленая ў сферы інструментальнай, вакальнай, харавой, аркестровай і камернай музыкі: фартэпіянная прэлюдыя «Фрэскі» Л. Абеліёвіча, «Ступенькі» Г. Вагнера, сюіты «Казка» і «Кантрасты» С. Картэса, цыкл «24 прэлюдыі» П. Падкавырава, «Мікракосм» і «Дзіцячы куток» Л. Шлег, а таксама мініяцюры Я. Дзягцярыка, І. Лучанка, Р. Суруса, Э. Тырманд і інш. Музычная мініяцюра нярэдка імкнецца да апасродкаванай сувязі з жывапісам («Фрэскі» Абеліёвіча, «Эцюды-карцінкі» Тырманд, «Музычныя карцінкі» Вагнера, «Акварэлі» для віяланчэлі К. Цесакова, «Замалёўкі» для балалайкі з фартэпіяна Шлег і інш.).

Мініяцюра з выяваю евангеліста Марка. Супрасльскі скрыпторый, XVIII ст.

У тэатры, цырку, на эстрадзе – кароткая п'еса, вадэвіль, інтэрмедыя, скетч, размоўная, харэаграфічная ці музычная сцэнка, эстрадная або клоўнская рэпрыза і інш.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 21.02.2013
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 137.
Тыраж 1040 асобнікаў.